# ПАСХАЛЬНАЕ ПАСЛАННЕ
## Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі
## КІРЫЛА
## архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам і ўсім верным сынам і дочкам Рускай Праваслаўнай Царквы

**Узлюбленыя ў Госпадзе Праасвяшчэнныя архіпастыры, высокашаноўныя прасвітары і дыяканы, богалюбівыя інакі і інакіні, дарагія браты і сёстры!**

Сёння, у *свята над святамі і ўрачыстасць над урачыстасцямі*, што паводле слова свяціцеля Грыгорыя Багаслова, *настолькі пераўзыходзіць усе ўрачыстасці, не толькі чалавечыя і зямныя, але нават Хрыстовы і тыя, што дзеля Хрыста здзяйсняюцца, наколькі сонца пераўзыходзіць зоркі* (Слова 45. На Святую Пасху), з вялікай радасцю звяртаю да вас старажытнае і вечна новае, для ўсіх звыклае прывітанне, якое ў той жа час нязменна акрыляе нашы сэрцы:

**ХРЫСТОС УВАСКРЭС!**

У гэтых двух жыццесцвярджальных словах змяшчаецца столькі сілы, што ад іх твары людзей

ззяюць духоўнай радасцю і рэчаіснасць, якая акружае нас, літаральна перамяняецца: *неба, зямля і нават прадонне напаўняюцца святлом, бачны і нябачны свет святкуе, бо паўстаў Хрыстос – радасць вечная* (канон свята).

**У**васкрасенне Спасіцеля – гэта не проста гістарычная падзея, пра якую мы даведваемся са свяшчэнных тэкстаў. Гэта краевугольны камень веры і, паводле слова свяціцеля Маскоўскага Філарэта, *вечная навіна, крыніца разважання, здзіўлення, удзячнасці і надзеі* (Слова ў дзень Святой Пасхі).

**У**цялесненнем, пакутамі і трохдзённым паўстаннем з мёртвых Спасіцель абнаўляе чалавечую прыроду, вызваляе нас з-пад улады граху і смерці, адкрывае людзям вароты Царства Нябеснага і паказвае нам шлях да адзінства з Тварцом. Менавіта ў Хрысце, *у Якім Бог прымірыў з Сабою свет* (2 Кар. 5, 19), усе мы маем магчымасць атрымаць усынаўленне і апраўданне, здабыць вечнае жыццё, *бо няма пад небам іншага імені, праз якое належыць нам спасціся, акрамя імені Ісуса, Якога Бог уваскрасіў з мёртвых* (Дзеян. 4, 10–12).

**П**аўстанне Спасіцеля з мёртвых ператварае смерць у бессмяротнасць, смутак – у радасць, безнадзейнасць – у надзею. На Крыжы і ва Ўваскрасенні нам адкрываецца Бог бясконцай дабрыні і дасканалай любові.

**У**сведамленне гэтай усёпераможнай любові Божай пабуджае нас да ўдзячнасці Стварыцелю

і дае нам сілы пераадольваць самы цяжкі душэўны стан і складаныя абставіны, узвышае над мітуснёй паўсядзённасці, дапамагае выправіць ранейшыя памылкі і пераадольвае адчай, які перашкаджае нам паўнавартасна жыць і духоўна развівацца.

Нярэдка людзі паддаюцца падманным уяўленням, што зло пануе і перамагае, а дабро ўяўляецца незаўважным і слабым. Наш розум сумняваецца ў сіле здзейсненага Хрыстом Адкуплення, калі бачыць вакол смерць блізкіх, чуе пра вечнасць пакут для грэшнікаў са старонак Евангелля і назірае за светам, *які ляжыць у зле* (1 Ін. 5, 19). Але Царква Божая на працягу тысячагоддзяў пераканаўча сведчыць: Спасіцель перамог грэх, *знішчыў смерць і спустошыў пекла* (свц. Іаан Златавуст. Слова аглашальнае на Святую Пасху). Хрыстос адолеў непазбежнасць смерці і ўсеагульнасць зла, і мы глядзім на іх паражэнне вачыма веры ўжо з жыцця будучага веку, з Пасхальнай вышыні.

Паўстанне Спасіцеля з мёртвых нагадвае нам не толькі пра самую важную падзею мінулага, але і сведчыць пра будучае ўсеагульнае ўваскрасенне, *бо калі мы веруем, што Ісус памёр і ўваскрэс, то і памерлых у Ісусе Бог прывядзе з Ім* (1 Фес. 4, 14). Нам жа неабходна праз выкананне запаведзяў Гасподніх, праз здзяйсненне спраў любові і міласэрнасці, праз удзел у таінствах Царквы далучыцца да Хрыстовай перамогі і застацца верным Яму да канца, памятаючы словы

Свяшчэннага Пісання: *стойкасць патрэбна вам, каб, выканаўшы волю Божую, атрымаць абяцанае* (Яўр. 10, 36).

А таму, узлюбленыя браты і сёстры, паводле слова апостала, *не пакідайце спадзявання вашага, якому належыць вялікая ўзнагарода* (Яўр. 10, 35). І няхай свята Ўваскрасення Госпада Ісуса Хрыста будзе нязменным напамінам пра гэтыя праўдзівыя Божыя абяцанні, якія даюць нам надзею і сілы ў самых складаных абставінах. Няхай гэтая ўрачыстасць натхняе ўсіх нас жыць у веры і любові, ведаючы, што ні смерць, ні пакуты, ні зло не змогуць адолець нас, калі мы з Хрыстом і ў Хрысце, Які перамог грэх, смерць і ўсякую няпраўду.

Будзем жа *святкаваць Пасху Гасподнюю чысцінёю жыцця, прыстойнасцю і добрымі справамі* (свц. Афанасій Вялікі. Дзясятае пасхальнае пасланне), каб, пераменяючыся ў новага чалавека ў Хрысце і *служачы Богу жывому і ісціннаму, чакаць з нябёс Сына Яго, Якога Ён уваскрасіў з мёртвых, Ісуса, Які збаўляе нас ад надыходзячага гневу* (1 Фес. 1, 9–10). Амінь!



**ПАТРЫЯРХ МАСКОЎСКІ І ЎСЯЕ РУСІ**

*Пасха Хрыстова*
*2024 г.*